# ЭТНОГРАФИЯ

УДК 398 (=161.3)

## МЛЫНАРЫ ЯК НОСЬБІТЫ ЧАРАЎНІЦТВА Ў НАРОДНАЙ СВЯДОМАСЦІ (ПАВОДЛЕ ВУСНАПАЭТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ПІНШЧЫНЫ)

***А.М. НЕНАДАВЕЦ***
*Бабруйскі філіял Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта,*
*г.Бабруйск, Рэспубліка Беларусь*

Так павялося, што ў народных уяўленнях вадзянік кантактаваў толькі з прадстаўнікамі трох «прафесій» – млынарамі, рыбакамі і пчалярамі. Дакладней з тымі, хто меў прамыя адносіны да вады ці займаўся на вадзе нейкай дзейнасцю (у дадзеным выпадку, будзем лічыць, прафесійнай). Спынімся на гэтых адносінах падрабязней, тым болей, што ўзаемаадносіны вадзяніка з млынарамі былі незвычайна цікавымі і своеасаблівымі. Е. Раманаў адзначаў: «Механік, які будуе вадзяныя млыны, а потым і сам млынар абавязаны знацца з вадзяніком і ўсяляк з ім ладзіць. У адваротным выпадку вадзянік не раз парве млын пры будаўніцтве і ў будучым будзе яго ламаць і псаваць. Звычайна вадзяніку даюць паднашэнне: закідваюць у плаціну жывую курыцу, хоць патрабуецца хрысціянская душа». У этнаграфічных запісах з Гродзенскай губерні ёсць сведчанні, што ў былыя часіны ў падобных выпадках закопвалі жывых сірот. Пчаляры таксама прадаюць сваю душу вадзяніку, каб мець многа пчол, мёду і воску. Пра такіх пчаляроў гавораць, што «ў іх носе нешта ёсць!»[1].

Справа ў тым, што з даўніх часін у народзе назіраецца цікавая з’ява – чалавека, які вылучаўся сярод астатніх незвычайнымі здольнасцямі, заўсёды абвінавачвалі ў сувязях з нячыстай сілай. Тлумачэнне гэтаму было простае – ён мог зрабіць тую рэч, якая іншым была не пад сілу, ці прымушаў працаваць на сябе водную стыхію, што таксама асацыіравалася з чортам. Для млынароў, адпаведна, такім памошнікам быў вадзянік. Чым можна растлумачыць, напрыклад, тое, што млынар трымаў млын на самым вадаёме і не баяўся, што вадзянік яе разбурыць? Мала гэтага, чалавек яшчэ і значны прыбытак ад свайго занятку атрымліваў, жыў лепей за іншых. Гэта давала падставы і для аналагічных заключэнняў. А. Афанасьеў аўтарытэтна заяўляў: «На ўсялякім млыне жыве толькі па адным вадзяніку, і нават болей, кожны вадзянік загадвае сваім колам. Млынар абавязкова павінен быць варажбітом і сябраваць з нячыстай сілай, інакш справа не пойдзе на лад» [2].

Запісы вуснапаэтычнай творчасці апошніх 20-25 гадоў таксама станоўча адказваюць на факт сцверджання сяброўства паміж млынарамі і вадзянікамі. Паведамлялася пра гэта на поўным сур’ёзе, без долі нейкага там сумнення ці жарту. Болей таго, можна адназначна сцвярджаць і пра захаванасць традыцыйных поглядаў у мясцовага насельніцтва на млынара, які нібыта асацыіраваўся ў іхняй свядомасці з усім самым адмоўным, а іншымі словамі, - з нячыстай сілай ці нячысцікам (чортам). У дадзеным артыкуле мы прыводзім прыклады, якія датычацца аднаго толькі млынара – гаспадара вадзянога млына. Але яго лічылі ў навакольных вёсках Піншчыны моцным варажбітом. Матэрыялы запісаны больш за дваццаць гадоў таму і нідзе раней не публікаваліся.

«У нас даўно мельніца стаяла. На ўсю раку адна такая была. Огромная, здаровенная. Со всех окрестносцей ехалі сюда муку молоць. До этого времені тое месцо на реке Мельнічным называюць. Сам мельнік з роднымі жыў неподалёку, на хуторы. Это быў суровый чаловек. Ліш бы з кім за ўвесь день мог не перэмолвіцца словом-другім. Стоіт або сідзіт, што той камень-моўчун, ўсё на этом. Від также імеў необычный: обросшій, лохматый. Неакуратный і, што самое главное, глаза ў его всегда блестелі. Пожілые люді говорылі – это как раз і есть свідетельство того, што он знаецца з нечістой сілой, што пры её определённой помошчы получает сабе прыбыль. Ешчо у его брові на перэносіце сросліся. Як нахмурыцца, так аж мороз по кожы, кажэцца, што чорт у цебя ўсматрываецца. Этот чэловек не бояўся ходзіць по берегу рэкі ў любую погоду, мог купацца і крычаць пры этом во ўвесь свой голос. І говорылі, будто бы іменно ён мог остановіць буру. Выйдет на свою плоціну, повернецца до мельніцы спіною і смотрыць унімательно на воду, слоўно

ПолесГУ

кого-то высматрывае ў неспокойных волнах.Ўначале неподвіжно стоіць, а потом начынае што-то шэптаць. Про што ён шэптаў? Хто его знае. Блізко к тому мельніку ніхто не подбіраўся, потому што бояліся» [АПЗ (1)]; «У нас мельніца когда-то стояла, і на ней хозяйнічаў одзін старый дед. Опытный чаловек быў, нічого і нікого не бояўся. Про его говорылі, што ён цесно дружыў з водяным. А як жэ по-другому могло быць? У ўсех вокруг голод, холод, а ў мельніка ўсего хапае. Мало того, утверждалі, што за ўсю жызнь его мельніца ні разу не была разрушэна, не горэла, пошті не ломалася, у её дажэ молнія не біла. Дзе ж вы такое ўстрэчалі? На рэчку выбіраўся на лотцы одзін. Нікого больше не браў. Не бояўся, відно, што случыцца што-то плохое. Сам старый выдзеляўся здоровенным горбом. Говорылі. што его такім ведзьма сделала за какой-то грэх. Тот мельнік за проста так не помогаў. Відно бояўся штобы сіла даром на другіх не трацілась. Могло быць і такое: у его такая договорённость была з водзяным – не помогаць другім. Одзін раз відзелі дажэ, как тот старый на воду шэптаў што-то. Будто бы водзяного благодарыў за помоч або, можэ, просіў помогаць у далейшым. Мельніку на вочы не особо стрэмілісь попадацца, бояліся его злых глаз, того, што ешчо якую-небудзь болезнь на чэловека накіне. Нет бы к чему хорошему, а к гэтому ўсякіе ведзьмакі і чародзейкі былі на удзіўленіе прыспособлены. Сільно зачароўвалі, раз воду моглі прыговораць і яна становілась послушной: не круцілась, не ломала плоціны, не порціла мельніцы. Такі чэловек на нашых вочах жыў. А як помер, тогда только ў его дом перун ударыў і ўсё дочыста згорэло, будто бы і не было нікогда гэтых построек» [АПЗ (2)]; «Мельнік – родной брат чорта, а інакш і быць не можэ. Как же он себе мельніцу построіць, еслі з нечысціком знацца не будзець? Говорылі, што мельнік своему сыну професіёнальные секрэты передае. Когда почуствуе смерць, то і пересказывает. У его родні, звычайно, мало было. Дзецей – одно, двое і ўсё на тым. Бояліся чародзеі, штобы іх секреты не сталі шыроко ізвесны, і штобы дзеці не голодалі. Мельніц жэ тогда немного было, і не было возможносці даць кажному сыну по одной. Мельніцу поставіт себе і сыну потом передае, штобы на новое место не перэбірацца, потому што там ведзь может не найці своего опекуна-нечысціка. Мельнік не боіцца, што чорт разбушуецца. Оні жэ дружат. І еслі што, то нечысцік скоро успокоіцца, штобы не обіжаць свойго подзельніка. У нас быў такой чэловек, ён і крэсцьянам многа зла, многа беды прынёс, потому што насылаў на іх ўсякіе болезні. Ён ідзёт по водзе спокойно, не оглядываецца, не беспокоіцца, што сейчас его за ногі водзяной ухваціт, потому што тот просто не імеет над нім власці. Стане перэд началом работы на плоціне, посмотрыць на воду, пошэпчэ какіе-то таінственные слова і начынае молоць. Ужэ, наверное, уверэнный ў правільносці того, што ён дзелае, іначэ і быць не могло. Такой вот страшный мельнік жыў, чародзей-ворожбіт чрэзвычайно сільный» [АПЗ(3)]; «Млынар у блізкім сяброўстве з вадзяным, таму што ён даўным-даўно, калі толькі пачынаў сваю справу, прадаў яму душу. А вадзянік – гэта той жа самы чорт. Нічым асаблівым ён не адрозніваўся ад астатніх нячысцікаў. Такі гаспадар ведае, як падыйсці да вадзянога валадара нават у хвіліны самай найвялікшай раз'юшанасці. Калі хто прыглядваўся, то, відаць, заўважыў, што вадзянік злуецца, уздымае хвалі, пераварочвае чаўны, залівае лугі і палі, а да плаціны, якая насыпана ля млына, не падбіраецца. Дзіўна ўсё атрымліваецца, там хвалі, як хаціны, а тут, усяго за пару крокаў, спакойненькая вадзіца, нібы ў калодзежы. Падчас буры ці навальніцы млынар абавязкова дзяжурыць на млыне. Баіцца, каб вадзянік не забыўся ці ненарокам не абрынуў свой гнеў і на ягоную пабудову. Стаіць і штосьці шэпча. Млынару-варажбіту хрысціцца нельга, ён, напэўна, прамаўляе аднаму яму толькі вядомую замову. Яе пад вялікім сакрэтам млынар перад смерцю перадае свайму старэйшаму сыну. Калі ж сыноў у млынара няма ўвогуле, то гэта для яго найвялікшае гора, таму што чужым людзям, у якіх бы добрых ён з імі не знаходзіўся адносінах, замову пераказваць нельга. Тады чароўныя веды, магчымасці і здольнасці, запазычаныя ад вадзяніка, паміраюць разам з млынаром» [АПЗ(4)].

Такую ж самую асаблівасць адзначаў у сваіх працах і Я.Ляцкі, які пісаў: «Паводле агульнапрынятай думкі, млынары сябруюць з вадзянікамі і карыстаюцца іхнімі паслугамі для паспяховага вядзення сваёй справы і ў тых выпадках, калі проста неабходна дапамога звышістотнай сілы... Падзьме млынар на ваду, пашэпча яму аднаму вядомыя словы – і справа зроблена, жаданне выканана. Адносіны з нячысцікам адбіраюць у млынара магчымасць загінуць ад вады: іменна млынары ніколі не топяцца» [3]. У гэтым выказванні якраз і падкрэсліваецца факт непатапляльнасці млынара. Лішні раз указваецца, што сам ён быў надзвычай моцным варажбітом, якому было дастаткова «пашаптаць на ваду» і ўсё навокал супакойвалася.

У народнай творчасці захавалася нават думка, чаму так шанаваў вадзянік свайго сябрука млынара. Аказваецца, мала таго, што гаспадар быў звязаны з нячыстай сілай, запрадаў ёй сваю душу, дык ён яшчэ і пастаянна прыносіў вадзяніку ахвяры, паднашэнні, таксама ледзьве не

ПолесГУ

абагаўляў яго: «Вопытны млынар з вадзяногa млына пры першых замаразках, калі вада пакрываецца ледзяной скарынкай, апускае вадзяніку пад кола кавалак сала, «каб калёсы не скрыпелі», так растлумачыў гэта стары млынар Рыгор Парэцкі, а калі забіваюць свінню, то кідаюць і цэлую нагу. Па вялікаму рахунку непераборлівы вадзянік задавальняецца і часткай свіных кішак, пакрытых тлушчам. Не прынясі млынар гэтай ахвяры вадзяніку, - будуць праблемы са смазкай для колаў, вадзянік будзе вылізваць яе з буксаў і злізваць з восяў і, акрамя таго, можа шмат нашкодзіць» [4]. У А.Афанасьева знаходзім наступнае сведчанне: «Млынары, каб вадзянік не прарваў плаціну, адзін раз у год прыносяць яму адкормленую чорную свінню; хто гэтага не зробіць, таго ён замучыць падчас сну, а плаціну абавязкова размые. Як певень, што служыў сімвалам агню, быў прысвечаны дамавіку і лічыўся найлепшай для яго ахвярнай ежай, так і гусь, прадстаўнік воднай стыхіі, прадназначаўся вадзяніку. Калі выкінуць жар з коміна, то з мэтай захавання хаціны ад пажару, апускаюць у яго жывога гуся: сродак гэты, паводле народнага звычаю, такі ж выратавальны, як і вада, што залівае агонь. Гусі і качкі ўсё лета жывуць на рэках, азёрах і вадаёмах пад наглядам дзядулі-вадзяніка, а на зіму пакідаюць замёрзшыя воды. У сярэдзіне верасня, калі становіцца адчувальным набліжэнне зімы, вадзяніку ахвяруюць гуся як развітальны падарунак – падзяку за тое, што ахоўваў хатніх гусей і качак на працягу лета» [2, с.417-418].

А.Афанасьеў гаворыць пра гуся і не звяртае асаблівай увагі на тое, якой афарбоўкі ён быў – шэры ці белы. І дарма, таму што ў такой адказнай справе гэта было надзвычай важна. Вадзянік жа асабліва любіў чорны колер: «Вадзянікі суадносяцца з чорным колерам: ім прыносілі ў ахвяру чорнага казла, чорнага пеўня, існаваў звычай трымаць на млынах чорных жывёлін, якія падабаюцца вадзяніку» [2, с.418].

«Патрэбна абавязкова мець на ўвазе, што калі, напрыклад. трымалі пеўня ці пеўняў на млынах, дык абавязкова чорнага колеру. Справа ў тым, што даследчыкі сцвярджаюць пра сувязь пеўня і з падземным светам.Тут вялікую ролю іграе афарбоўка пеўняў: калі светлы, чырвоны певень звязваўся з агнём, сонцам, то чорны – з вадою, з падземным царствам і сімвалізаваў сабою суд Божы, зло. Так, Казьма Пражскі ў «Чэшскай хроніцы» (XI-XII стст.) паведамляў аб звычаі хадзіць да крыніц і забіваць там чорных пеўняў і курэй, адначасова заклікаючы нячысціка. Яшчэ ў XIX стагоддзі існаваў звычай тапіць пеўняў і курэй ў вадаёмах у дзень Святога Фейта. Вядомы таксама і абрад рускіх людзей, калі яны прыносілі ў ахвяру вадзяніку пеўня, якога жывым закопвалі ў зямлю, і звычай трымаць на вадзяных млынах чорных пеўняў і іншых жывёлін чорнага колеру (напрыклад, катоў), таму што гэты колер лічыўся свяшчэнным» [5].

Адпаведныя прыклады сустракаюцца і ў нашых запісах: «Мельнік наш, Максым, одзін быў у отца. І, што самое глаўное, его отец тожэ молоў муку. Когда с кем ўстрэчался, то даже не здоровался. Не тому што лэніўся, а тому, што не хоцеў на людей свою чароўную сілу ізрасходовать. Говорылы, што когда слово-другое промолвіць, так і на гэто якіе-то его усілія ідуць, а оні ж потом ему могуць понадобіцца, штобы з водзяніком водзіцца. У его была пара котоў. Такія ужэ страшныя, Здоровенныя, чорныя, як ноч, вочы тыя, што талерочкі. Як уставіцца на чэловека, так здаецца, што гэто пара нечыстых за душу ўхваціліcь. Оні ў его і не муркалі, одно толькі лежалі, і не абы-дзе выцягівалісь, а на плоціне, што около млына насыпана была. Лежаць собе на сонцы і ўсё. Хозяін жэ іх только салом одным корміў. Найбольш опытные людзі говорылі, што гэто посланцы водзяніка на землі і ёны за порадком следзілі, наблюдалі, як мельнік дзелаў ўсё так, як іх хозяін трэбоваў» [АПЗ (5) ]; «У нашэго мельніка певень жыў на подворку. Отлічаўся тем, што, во-первых, быў чорным-чорны. А во-вторых – сувсім безголосый. Ніхто і нікогда не чуў, штобы ён запеў, як это дзелают другіе пеўні. Захлопаў крыллямі. Только еў і еў. Будто ў бездонный мех зерно сыпаў. Говорылі. што чорного петуха мельнік держаў не больш трох лет, потом ў одну із цёмных ночэй топіў около своей мельніцы ў водзе і сразу жэ заводзіў другого. Без чорного петуха хозяін не чуствоваў той сілы, которая была перэдадзеная ему од водзяніка» [АПЗ(6)]; «Каб только імець наібольшы прыбытак, мельнік ішоў на ўсё. Продаваў свою душу водзяному, і той тогда убеждаў хозяіна, што поможэ ему ў любом выпадку. Праўда, часто обешчаць то обешчаў, але не особо довераў, потому што вынуждаў мельніка прыносіць ему ўсякія жэртвы. Пры гэтом трэбовал толькі жэртвы чорного і ніякого другого цвета. Потому любый мельнік дэржаў на своім подворку ці чорного козла, ці чорного пеўня, а колі не мог завесці гэтых жывёлін, то заводзіў хоця бы чорных котоў, якіе тожэ говорылі про нэчыстую сілу» [АПЗ(7)].

У вышэй прыведзеных прыкладах гаворка вялася пра ахвяраванне толькі чорных жывёлін і чорных птушак, але згадваюцца выпадкі, у якіх зафіксавана проста паднашэнне ахвяры, без усялякага падзелу ў залежнасці ад афарбоўкі: «У Архангельскай губерні пра прыбываючую ваду

Полесгу

гавораць, што яна зажывае. У гэты час гняўлівага вадзяніка ўлітасціўляюць ахвярамі. Сяляне, сабраўшыся, купляюць кабылу, не таргуючыся пры гэтым; тры дні адкармляюць яе хлебам і адходамі канаплянага масла; потым спутваюць ёй ногі вяроўкай, на шыю прывязваюць два жарнавыя камяні, галаву абмазваюць мёдам, у грыву ўплятаюць чырвоныя каснычкі і апоўначы апускаюць яе ў апалонку (калі яшчэ стаіць лёд), ці топяць пасярод ракі (калі лёд сышоў). Тры дні чакае вадзянік гэтага падарунка, час ад часу паказваючы сваё незадавальненне калыханнем вады і глухімі стогнамі. Задобраны паднашэннем, ён уціхамірваецца» [2,с.417].

Як бачым, А. Афанасьеў зафіксаваў усеагульную ахвяру, калі яе можна так вызначыць, сялян вадзяніку. Трэба падкрэсліць, што хоць вадзянога валадара баяліся і паважалі, тым не меней, ахвяры прыносіліся на Беларусі не ўсімі сялянамі, напрыклад, нейкай канкрэтнай вёскі, а млынарамі па-асобку: «Своімы вочыма бачыў, як наш мельнік свыной окорок у воду ўкінуў. Як шлёпнуў, то толькі пырскі во ўсе бокі полэтелі. Коло ёго стояў чорный собака і ўсё оглядваўса, усё прынюхваўса. Можно було подуматы, шчо ён охраняў хозяіна і тое, што той робыў во ўрэмя того тайного обрада. Потом ешчо штосьці мельнік шэптаў і бросаў кускі хлеба ў воду. Тры раза кінуў. Цэлый коровай разломаў на тры часці і ўкінуў у воду. Не іначэ, як што-то ворожыў, а можэ, сілу водзяного перэнімаў» [АПЗ(8)]; «Хто мельніцэй ўладзеў, той, ізвесное дзело, з водзяным знаўса. Іначэ ёму і жыць нельзя было, потому што не сушчэствовало бы ніякого благополучыя. Мало жэ мельніцу построіць, её ешчо нужно і сохраніць, зберэч от гнева водзяного. Тут ужэ мельнік браўса подкупіць хозяіна воды, штобы тот односіўса до ёго поблажліво і благопрыятствоваў у ізбранном дзеле. Мельнік хітро поступаў, откупліваўса подношеннем. Но его можно было прыносіць не кажный дзень і дажэ не ў любы час дня, а толькі ў обозначаны срок, который мельнікі обязацельно зналі. Поросят молодых паркамі кідалі ў воду. Что-то такое дзелал мельнік, што ёны дажэ і не візжалі, а лежалі ў его руках жывыя і молчалівыя. Некоторыя убеждалі, што перэд эцім подліваў поросятам ў еду самогонкі і тыя ўпіваліся. Як бы там ні было, але поросят кідалі – гэто точно» [АПЗ(9)].

Сустракаюцца ўказанні і яшчэ на некаторыя віды ахвяраванняў. Напрыклад: «У першыя заморозкі мельнікі жэртвовалі ему мясо. А ў некоторых месцах рыбакі звертались до ёго з просьбой помогаць у лоўлі» [АПЗ(10)].

Здавён млынара баяліся і за лепшае лішні раз лічылі з ім не звязвацца. Усялякае магло здарыцца, і тым болей, калі справу маеш з чалавекам, які запроста мог падтрымліваць сувязі з нячыстай сілай, а раз так, то, атрымліваецца, і сам разумеў тое, чаго зразумець простаму смертнаму было не дадзена. Сяляне, якія любым чынам імкнуліся забяспечыць сваю асабістую недатыкальнасць, разумелі, што поўнасцю нейтралізаваць уздзеянне чорнай сілы, якая сыходзіла ад млынара, яны не здолеюць, але нейкім чынам папярэдзіць удар, змякчыць яго ім было пад сілу. У якасці ўсемагчымых абярэгаў, па сцверджаннях сялян, маглі выступаць самыя розныя прадметы, замовы, малітвы, нават дзеянні. Пастараемся разглядзець усё гэта па парадку.

Спачатку неабходна спыніцца на замовах, увогуле рэдкіх прыкладах, звязаных з аховай жыхара вёскі, які вёз на памол зерне, ад уздзеянняў млынара, ад тых злых учынкаў, якія ён мог чыніць сумленным працаўнікам. «Первым разом, добрым часом, Господу Богу велікому пану, помолюса, Хрысту самому поклонюса. До млына еду, шчыросці прошу, оховы шукаю, от его цёмных вочэй уцекаю. Учора, ешчэ звечора, соўнейко ласкаво іграло, дорогу мне добрую прэдвешчало. Сегоння с ранку зара заняласа, чырванню накрылась, мне знак давала, што ў млынара сілы не стане, усіх людзей словом своім злым ні ў якім разе не достане. Зара засевалася, з сонцам ясным у небе сустракаласа. Там залотыя ключы ў рукі свое брала, дубовую дверцу одмыкала, сілу чыстую супроць мельніка злого выпускала. За гэты палог шаўковый подымала, соўнейка шчырае выпускала, добрую дарогу ўсім людзям чэсным прадвяшчала, а майму ворагу – рот замыкала, рукі звязвала, вочы платком чорным шчыльно заслоняла. Устаў я раным-рано, подыйду к воконцу, шчырым-шчыра ўздыхну да Бога, дай жа мне, Божа, шчаслівую паездку, лёгкую памолку, ад мельніка толькі радасць-спагаду і ніякой трасцы. Сам святы Юрый мне каня варанога запрагае, святы Власій усю дарогу не адыходзіць, а памагае, ўсялякую нечыстоту одгоняе, от ліхой напасці зберэгае» («Перэд дорогай на мельніцу»). [АПЗ(11)].

Гэта вельмі рэдкая замова, якую нам удалося зафіксаваць у адзіным варыянце. Усе астатнія замовы характарызаваліся як агульныя і называліся няйнакш, як «Ад чаравання», «Ад злога ведзьмавання», «Ад чарадзейства» і г.д., а млынар у іх выступаў адным з персанажаў, варожачым супраць «чэсных хрысціян», «Зара другую зару займае, свету белага, свету божага шчыра жадае». Сама Прэсвятая Богародзіца ангелаў ажыдает. Ангелаў сваіх ажыдае і ім угаварае: «Ангелы маі, храніцелі маі! Засцеражыце раба божага Антона от нечыстой сілы, от трыдзевяць колдуноў, от

трыдзевяць ліхіх ведуноў, от чорного млынара, от его чарадзеяння, ад усякай уражаскай сілы, от ведзьмы-чародзейніцы. Адгарадзі яго, Госпадзі, жалезною, непрабіўною даскою. Каб ніякая сіла яго не дастала, каб уся нячыстая бокам абмінала. Толькі тады яго ведзьма дастане, злая сіла на яго абвяне, от мельніка ён гора зазнае, колі гэто ўсё ліхое тую крэпкую сцену ілбом прабіваць стане, сковороду одсуне, а доску согне і сілою проломіць.

На горэ Сіяньскуй стоіць цар-цэркуў, у той цэркві высокіе прэстолы стояць, ранніе заутрэнні воспеваюць, службы святыя совершаюць, проскоміды от злых ведзьмоў і іхняго ведзьмовання доставаюць, херувімоў выслаўляюць. Святый Міхайло на прэстолі стоіць, бачыць усіх чысто нас, і праведнікоў і ябеднікоў, і нагоніцеляў, і ведзьмоў-чародзейніцаў, і млынароў-колдуноў; і разбіваець-поражаець усіх іх велікою громою, пекучою моланнёю, жэлезною скалою, а мельніка того топчэ своім богатырскім конём, сячэ своім войстрым мечом. Освеці, господі, гэтую часіну, поможы рабу божому Антону, шчоб ён нікого не бояўса, а тобою от злого чаровання прыкрываўса! Амінь!» [АПЗ(12)].

Часам у якасці слоўнага абярэга ад злой сілы млынара выкарыстоўвалі замовы, якія насілі назву «падарожных» і шапталіся перад адпраўленнем у дарогу. Сапраўды, атрымлівалася, што дарога да млынара – гэта ж таксама дарога. Няхай сабе і не такая ўжо і далёкая, затое надзвычай небяспечная і адказная, мало што потым мог прывезці гаспадар у сваю сямейку. «Шлях караценькі да млына і назад. Дарогі той на поўдня, да працы на столькі жэ. Солодкое дзераво к осіне горкой не прыстане, к мойму господару (імя) у дарозе нічога не прыстане. Як конь жэрабя не прывядзе, так і пуць гэты да ліхога не прывядзе; як певень за своё жыццё яйко не знясе, так і пуць да мельніка нічога злога не прынясе; як бык цяля ніколі не прывядзе, так і дарога да бяды не прывядзе. Святы Юрый, Святы Мікола і Святый Антоній, да помошчы прыступайце, мне сілы давайце. Каб як поехаў, то так і прыехаў, а што злое ўссела, то коб ёно на гуркую осінку по дорозе начэпілоса. Амінь» («Замова ў дорогу на млын, ці куды ў іншэе место») [АПЗ(13)].

Усемагутным абярэгам у такіх выпадках заўсёды выступаў сімвал хрысціянскай веры – нацельны крыжык. Вопытныя людзі ў такіх справах падвучвалі менш ведаючых: «Як мой бацько ехаў молоць до Максіма на млын, то я сама гэто бачыла на свое вочы, як ужэ собіраўса выезжаць з двору, то свой крыжык доставаў з-под рубашкі і перэкідваў его собе на спіну. Так, говорыў, шчэ ёго дзед робыў, то і ёго навучаў. Тогді ныякі знахар нэ страшный. А про Максіма люды вэльмі дрэнно говорылі. Боялыса млынара, шчо якое чародзейство напусціць, не дасць спокойно змолоць і вернуцца додому жывому-здоровому. Крыжык божый, з-за того, шчо его постоянно на грудях носяць, то грудзі заўсегда прыкрывае, а раз на спіну перакінеш, то і з-заду прыкрые, не дасць прыцапіцца злому і ліхому, чорному і чародзейному» [АПЗ(14)].

Зафіксаваны намі і варыянт, дзе гаварылася, што перад паездкай усё да таго ж Максіма, селянін не перакідваў крыжык на спіну, а вешаў на шыю яшчэ адзін, але ўжо не на грудзі, а якраз-такі на спіну. Мала гэтага, адзначалася, што крыжык бралі ў мужчыны з гэтай жа хаты. Лічылася. што сіла мужчынскага крыжыка значна мацнейшая, чым жаночага. «Мой дзед, як ехаў до Максіма на выселок, то заранёў собіраўса. Там тое і дорогі было – версты тры-чатыры, а дзед ешчэ з вечора пачынаў рыхтовацца. Надто ж верыў, што той млынар страшные вочы мае і на іх лепей не трапляцца лішні раз, шчоб нічого не случылосо. Ён тады до свойго крыжыка вешаў ешчо і бацькоўскі. Але гэты вешаў не прамо на грудзі, а, помоліўшыса, закідваў на спіну. Надто дзелово ўсё робіў, не говорыў ні до кого, не жартоваў, а больш моўчаў. На ноч з вечора крыжык другі надзеваў. Бачыць доводзілоса мне не раз, вот і расказваю вам про гэто» [АПЗ(15)].

На гэтым бадай што ўся рэлігійнасць і вычэрпвалася. Далей згадваліся ў асноўным абярэгі, якія не былі агульнымі для жыхароў Палескага краю. Атрымлівалася так, што ў кожнага гаспадара быў свой «сакрэт», які дапамагаў яму не патрапіць у нерат, пастаўлены хітрым млынаром. Што перабольшвала сярод гэтых абярэгаў? Хутчэй набор нейкіх цяжкатлумачальных дзеянняў, спалучэнне ўсемагчымых прадметаў ці фетышызм нейкага канкрэтнага прадмета. Самае цікавае, што ім магла быць анучка (некалькі анучак), пуга, хлебная дзяжа і г.д. «Наш бацька, колькі я сама памятаю, то збіраючыса ў млын да Максіма, быў заўсегда ж вельмі моўклівы, ні з кім не говорыў. Нешто собе толькі под нос бубніў. Можэ, якую молітву. Хто ж его ведае. Только знаю, што мешкі он грузіў на воз заўсегда з правого боку. Так выбіраў стаць, штоб толькі з его накідаць. Як бы не выпадало, але ўсёроўно ж свойго трымаўса. Одзін раз запыталася, чому ж ён так робіць? То сказаў ціхо-ціхо, коб ніхто лішній не чуў, што гэто ўсё од того, штобы Максім не приставаў, штобы чародзейство своё на ёго не кідаў. Про того Максіма ў нас говорылі, што любого чоловека, які яму не поноровіцца, то можэ запросто зачороваць. Хворобу якую запросто напусціць, або якую беду на зло нашле» [АПЗ(16)].

ПолесГУ

Некаторыя запісаныя намі эпізоды, сведчаць пра тое, што нават прадметы, якія пільны гаспадар вымушаны быў замяніць перад паездкай да млынара з-за таго, што яны маглі проста не вытрымаць цяжару гружонага воза, людзьмі, якія заўважалі гэта збоку, усё тлумачылася, як існаванне пэўных абярэга ад уздзеяння чараўніцтва. «Даўно ўсё гэто було, але як наш бацько до млынара Максіма збіраўса, то обязацельно на коня хомут новый одзеваў. Обязацельно, хоця ён быў хорошым хозяіном і ўся збруя ў его ўсегда была спраўная. А тут, як только ехаць, то хомут меняў. Нейначэй, гэто од того, што не хоцеў, коб той млынар ему што благое не ўчыніў. Бацько то сам нічого не говорыў» [АПЗ(17)]. Эпізод, як эпізод, але дарога ад вёскі Дабраслаўкі, дзе намі быў зроблены запіс, да млына была такая ўжо пясчаная, што там запроста мог не вытрымаць і новы хамут, не тое, што «стары, але моцны». Таму дадзены выпадак адносіцца да звычайнага імкнення перасцерагчы сябе ад усемагчымых паломак і непрыемнасцей у дарозе.

У другім выпадку сцвярджалася яшчэ больш незразумелае: «У млын збіраючыса, то мой бацько доўго старанно рыхтоваўса. Подмазваў колёсы, провераў закруткі, оглоблі, хамута. Браў з собою колькі запасных кожаных паскоў і вяроўку, каб колі што ўсё ж не вытрымае і порвецца, то коб было чым подвязаць. Воз браў толькі свой. Ні ў якім разе ў такую поездку нельзя было браць чужый, бо хітрый мельнік усёроўно догадаецца і другім перэкажэ, што за господар до ёго прыехаў, што нават воза свойго не мае. Яшчэ бацька заўсёды браў з собою новую сыромятную пугу. Я гэто точно помню. Яна ў яго заўсёды ў клеці вісела, без дай прычыны, а кожный дзень, то пользоваўса другой. А гэту як браў, то нешто, одворочваючыса, над ёю шэптаў. Калі вяртаўса назад, то, пасміхваючыса, пугу вешаў назад у клець. Мама моя ўжэ мне говорыла, што наш бацька слова знае, якое допомогае ему ат зайздросных і чародзейных вочэй. Таму до ёго Максім і односіўса добрэ, ніколі своіх чароў не накінуў» [АПЗ(18)].

Калі ехалі на млын да заведама моцнага знахара, то ні ў якім разе не імкнуліся змяняць што-небудзь з заведзенай сярод мясцовага насельніцтва традыцыі. Больш таго, лічылі, калі толькі што зробіш па-свойму, то тут жа абавязкова здарыцца бяда і сыходзіць яна будзе, як пакаранне за непакорны характар, іменна ад самога млынара. «Ведалі людзі, што млынар наш ліхій чаловек, то і імкнуліся любым пуцём ёму просто догождаць. Раз ён так сказаў, то рабі, не думай особо, добрэ гэто ці не. Ён жа не сам казаў, а ім тая нечыстая командовала, якой ён верно служыў. Потым нешчасны чаловек мучыцца, у его нешто здарылося, а з-заду, невэдомо скуль, смех дзікі нясецца. Таму думалі, што раз не пярэчыш яму, то гэта лепей за ўсё і аберагае, не дае чародзейному воку і запродадзеной душы Максіма над людзьмі хрысціянскімі свою сілу правіць» [АПЗ(19)]. Таму даволі часта даводзілася запісваць сведчанні наступнага характару: «Когда ж поехаў до мельніка Максіма, на его хутор, а ён, змалоўшы, сказаў, нібы-то параіў табе, прыязджаць да яго і ў наступныя разы, то ўсё гэто необходно спаўняць обязацельно. Не будзеш так робіць, то расправіцца по-свойму і ўжэ потым і не отпросішся, і не одмолішся. Такое сільное зло ў его было. Не одному хозяіну ён тут у нас у знакі даўса. Нікому не дароваў. Злую натуру меў. Што ажно страх. Наш сусед, после службы ў польскім войску, домоў вернуўса і, ажоніўшыса гаспадарыць стаў самостойно. Грамотным быў, а яшчэ здоровый, што той столетній дуб. Усім і заўсёды казаў: «Я ні ў Бога, ні ў чорта не верую!» Учуў такое Максім, ці передаў яму хто з сяброў, і так скруціў нашага суседа хворобой, што той на ногі ўзняцца не мог. Адно ляжаў і стогнаў. А мельнік наказаў яшчэ маладой яго жонцы, што калі хоча выбрацца ад нядуга, то няхай прыходзіць на млын парабкаваць. І што ж вы думаеце? Цэлый год парабковаў сусед за свой язык і за свою сілу. Затое потом, то бояўса лішній раз рот розявіць, так отвучыў ёго Максім» [АПЗ(20)].

Слава аб дурных учынках млынара, аб ягоным імкненні ў любым выпадку пакараць непакорнага чалавека, жыве ў наваколлі да нашага часу. «Той Максім, каб яму і сёння вочы павылазілі, моўму бацьку буў што подробіў і ўзяў дай закляў наш двор. Штоб нічого не водзілося, штоб нічого не плодзілоса. Пры людзях гэто сказаў. Віна бацькова была ў тым, што ён не захоцеў мельніковы мешкі цягаць. Сказаў, што я крыху одпочну, бо толькі ж свой воз нагрузіў, а потом і за твоё возьмуса. Ага. Той сразу, як розверэшчаўса, як роскрычаўса! І пры людзях закляў двор. Самое глаўное, што бацько заўсёды ўсё робіў, да его едучы, аберэгаючыся, думаючы. І тут такое. Ніякія молітвы не помоглі. Стаў у нас скот падаць. Нічого не плодзілосо і не велосо. І доглядалі ж, бо семейка наша старацельная була, рабоцяшчая. Нам усе тут у гэтом завідовалі. Покруціліся так цэлый год, а потом, добрыя людзі подвучылі, позвалі знахара, Левоша з Нового Двора. Той, як толькі прыйшоў, як толькі глянуў, то одразу сказаў: «Максімова работа. Ёго заклён». Пошэптаў нешто, походзіў і запэўніў, што ўсё далей будзе добрэ. Так і пойшло. Про того Левоша казалі, што ён, як знахар, быў моцнейшы за мельніка і той сам ёго бояўса. Нават, говорылі, што погоджаўса Левошу бесплатно молоць, коб толькі той за людзей не ўступаўса» [АПЗ(21)].

ПолесГУ

Лічылася, што ён можа запраста ўплываць на ўраджай. Варта яму было толькі захацець ці загарэцца помстай да кагосьці, як той чалавек адразу ж пачынаў адчуваць на сабе чарадзейную сілу млынара. «Ва ўсіх людзей жыта-пшаніца сілы набіраласа, каласавала, а ў нас адным зеллем ніву зацягнула. Ніколі раньше такого не бывало. Тут здарылосо. Такій ужэ год выдаўса страшный, што ў старцы ходзіць довелосо. Хлебнулі гора такого, што не дай Божэ, нікому іншому. Потом Левош нам новодворскій ніву одмоўляў. Его ходзілі ўсе нашы родныя просілі. Не одмовіў. Бацько запытаўса: «За што ж такая кара?» а ён усміхнуўса і говорыць: «А твоя жонка до мельніка жаць ходзіла? Вось нешто сказала, а ён почуў, ці подумала, а ён здогадаўса... Гэтого і хопіло, коб розыйшлосо егоное ведзьмарство...». Посля Левоша збожына крыху поправіласа, але ўсёраўно ўроджай буў вельмі слабый. Праўда, ніва нам вернулася» [АПЗ(22)].

Ведаючыя людзі сцвярджалі, што ў адносінах да млынара адзін абярэг дзейнічаў заўсёды эфектыўна і безадмоўна – Максіма трэба было добранька пачаставаць. Пры гэтым, асаблівага значэння не мела: дамоў яго да сябе запрашалі ці ж неслі пачастунак на млын. Галоўнае заключалася ў іншым – у асаблівым прыгатаванні самагону, які прадназначаўся для знахара. «Нас некалі старэйшыя падвучвалі, каб ведалі, як пазбаўляцца ад кляцьбы ды пагрозаў Максіма. Ён жа быў настолькі жадный, што ніколі дома гарачай ежы не поеў. Усё на ходу хапаў, усё нясвежае, гнілое, цвілое. Гаварылі, што з-за жаднасці і сямейку свою ў голодзе постоянно дзержаў. Дык вось, трэба было ўзяць пару колцаў коўбасы, окарака добры кавалак і бутылку горэлкі. Самае галоўнае, правільна падрабіць тую самагонку. Яе трэба было выгнаць, наліць у якуюсь шчыльно зачыненую посудзіну. А потом усыпаць туды пару жменяў зерна з нового уроджаю, коб ёна настояласа. Сама меней, так трэба было вытрымліваць недзе з недзелю. Потым зліць самогонку ў бутылку і несці мельніку. Як ён ужыве ўсё гэто, то обязацельно подобрэе до вашой родні і ніколі не будзе чэпаць. Гаварылі, што аднаго разу нехта, мабыць, падвучаны Левошом, подсунуў Максіму самогонку, настояную на лубіне. То так ужо поносіў, што потом ледзьве ногі смыкаў, але не помсціў тому чоловеку. Відаць, здагадаўса, хто за ім стоіць» [АПЗ(23)].

Такім чынам, да апошняга часу старадаўнія легенды і былічкі, усемагчымыя гісторыі, звязаныя з дзейнасцю і жыццём мясцовага млынара Максіма захоўваюцца ў памяці мясцовага насельніцтва.

Вядома ж, на гэтых вуснапаэтычных творах адчуваюцца ўплывы сацыяльна-эканамічных зменаў у грамадстве і, тым не меней, многае ўсёроўна застаецца на ўзроўні патрыярхальных разважанняў і меркаванняў.

Характэрна і тое, што назвы ўрочышчаў, прасёлкаў, дарог, нізінак і рачных заваротаў на рацэ Вісліцы, якая ўжо гадоў 30 як спрамлена меліяратарамі, захоўваюцца старадаўнія, што лішні раз указвае на трываласць захавання ў народнай памяці падзей мясцовай гісторыі.

## ПРЫНЯТЫЯ СКАРАЧЭННІ

**АПЗ** – Асабістыя палявыя запісы

## ЛІТАРАТУРА

1.Романов, Е.Р.Белорусский сборник. Вып. 8./ Е.Р. Романов – Вильна, 1912. -271 с.

2.Афанасьев, А.Н. Живая вода и вещее слово/ А.Н. Афанасьев. – М.: Художественная литература, 1988. – 318 с.

3.Ляцкий, Е.А. Представления белоруса о нечистой силе. Этнографическое обозрение. Кн.7/ Е.А. Ляцкий. – М.:1890.-176 с.

4.Богданович, А.Е.Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. / А.Е. Богданович. – Гродно,1895. – 186 с.

5.Ненадавец, А.М. Святло таямнічага вогнішча./ А.М. Ненадавец. – Мінск: Беларусь,1993. – 286 с.

6.Пункты 6 – 23 узяты з асабістых палявых запісаў, зробленых на Піншчыне ў 1980-я – 2000 гады.

ПолесГУ

## MILLERS AS BEARERS OF MAGIC IN NATIONAL CONSCIOUSNESS (ACCORDING TO ORAL-POETIC MATERIALS OF PINSCHINA)

*A.M. NENADOVETS*

***Summary***

Numerous folk recordings, made by the author regarding to national views on the miller's role in the patriarchal life foundations of the poleshuk peasants are considered. Great attention is drawn to the fact that a lot of things remained on the medieval patriarchal level, it is also accentuated that people managed to keep their strong belief in magic as well as its close connection with definite social groups of population of Pinsk region.

*Поступила в редакцию 27 апреля 2009г.*

ПолесГУ